УДК 316.752

# ЭВАЛЮЦЫЯ ПАНЯЦЦЯ *КАШТОЎНАСНЫЯ АРЫЕНТАЦЫІ* Ў РЭЧЫШЧЫ РАЗВІЦЦЯ МОЎНАЙ АДУКАЦЫІ

**В.І. Андрэйчык**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Акадэмія адукацыі"*

*Фарміраванне каштоўнасных арыентацый навучэнцаў выступае першачарговай задачай нацыянальнай адукацыйнай сістэмы. Прыярытэт абумоўліваецца скіраванасцю базавых адукацыйных дакументаў на выхаванне асобы як носьбіта каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры.*

*Мэта артыкула – выявіць эвалюцыю паняцця "каштоўнасныя арыентацыі" ў псіхолага-педагагічнай літаратуры, разгледзець асноўныя этапы яго развіцця ў адукацыйнай сферы.*

***Матэрыял і метады.** Для дасягнення мэты даследавання выкарыстаны наступныя метады: аналіз навуковых крыніц, параўнанне зместу адукацыйных праграм і падручнікаў, сістэматызацыя матэрыялу для вызначэння тэндэнцый у развіцці паняцця.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** Эвалюцыя паняцця "каштоўнасныя арыентацыі" ў псіхолага-педагагічнай літаратуры разглядаецца ў кантэксце сацыяльна-культурных змен у грамадстве (1920-я гады – пачатак XXI стагоддзя). Айчынная моўная адукацыя незалежна ад этапу развіцця арыентавалася на выпрацоўку каштоўнасных арыентацый вучняў, забяспечвала далучэнне асобы да культуры праз фарміраванне светапоглядных і маральных пазіцый.*

***Заключэнне.** Аналіз навуковых крыніц па праблеме даследавання сведчыць: паняцці "каштоўнасці" і "каштоўнасныя арыентацыі" не павінны атаясамлівацца. Каштоўнасці – жыццёвыя прынцыпы, якімі кіруецца чалавек, фарміруюць яго матывацыю і паводзіны, вызначаюць сацыяльныя і культурныя нормы. Каштоўнасныя арыентацыі – гэта ўстойлівая сістэма адносін, якая выпрацоўваецца пад уплывам сацыяльнага асяроддзя і індывідуальнага вопыту, вызначае мэты, ідэалы і жыццёвыя стратэгіі чалавека. Каштоўнасныя арыентацыі ў сферы адукацыі ўплываюць на развіццё асобы на ўсіх этапах яе сацыялізацыі, фарміруюць мадэль паводзін у грамадстве.*

***Ключавыя словы:** каштоўнасныя арыентацыі, каштоўнасці, моўная адукацыя, аксіялагічны падыход, фарміраванне каштоўнасных арыентацый.*

# THE EVOLUTION OF THE CONCEPT OF *VALUE ORIENTATIONS* IN THE CONTEXT OF LANGUAGE EDUCATION DEVELOPMENT

**V.I. Andreichik**
*State Education Establishment "Academy of Education"*

*The formation of value orientations of students is the primary task of the national educational system. The priority is determined by the focus of basic educational documents on educating the individual as a bearer of the values of national and world culture.*

*The purpose of the article is to trace the evolution of the concept of value orientations in psychological and pedagogical literature, to determine the main stages of its development in the educational sphere.*

***Material and methods.** To achieve the goal of the study, the following methods were used: analysis of scientific sources, comparison of the content of curricula and textbooks, systematization of material to determine trends in the development of the concept.*

***Findings and their discussion.** The evolution of the concept of value orientations in psychological and pedagogical literature is considered in the context of social and cultural changes in society (the 1920s – early 21st century). Domestic language education, regardless of the stage of development, was focused on the development of value orientations of students, ensuring the familiarization of the individual with culture through the formation of ideological and moral positions.*

***Conclusion.** An analysis of scientific sources on the problem shows that the concepts of value and value orientations should be separated. Values are the life principles that guide a person, shape his motivation and behavior, and determine social and cultural norms. Value orientations are a stable system of relationships, developed under the influence of the social environment and individual experience, which determines a person's goals, ideals and life strategies. Value orientations in the field of education influence the development of the individual at all stages of his socialization and form a model of behavior in society.*

***Key words:** value orientations, values, language education, axiological approach, formation of value orientations.*

Адной з ключавых задач сучаснай сістэмы школьнай адукацыі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца фарміраванне каштоўнасных арыентацый навучэнцаў. Прыярытэт абумоўліваецца скіраванасцю асноватворных дакументаў на выхаванне вучня як "носьбіта каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры" [1]. Вынікі засваення вучэбных праграм, сфармуляваныя ў адукацыйных стандартах, прадугледжваюць фарміраванне каштоўнасцей асобы, прынятых у беларускім грамадстве.

Мэта артыкула – выявіць эвалюцыю паняцця *каштоўнасныя арыентацыі* ў псіхолага-педагагічнай літаратуры, разгледзець асноўныя этапы яго развіцця ў адукацыйнай сферы.

**Матэрыял і метады.** Пры аналізе паняцця *каштоўнасныя арыентацыі* выкарыстаны працы айчынных (Г.М. Валочка, Л.С. Васюковіч, В.У. Зелянко, В.А. Маслава, В.У. Протчанка, В.Ф. Русецкі, М.Г. Яленскі) і расійскіх (Б.Г. Ананьеў, А.Д. Дзейкіна, Н.А. Жураўлёва, А.В. Кір'якова, Д.А. Лявонцьеў) навукоўцаў па праблеме фарміравання каштоўнасцей. Для дасягнення мэты даследавання выкарыстаны наступныя метады: аналіз навуковых крыніц, параўнанне зместу адукацыйных праграм і падручнікаў, сістэматызацыя матэрыялу з мэтай вызначэння тэндэнцый у развіцці паняцця.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Сучасны адукацыйны працэс мае каштоўнасна-арыентацыйную аснову, асаблівая ўвага надаецца ролі базавых каштоўнасцей у развіцці асобы. Эвалюцыя даследаванага паняцця адбывалася пад уплывам сацыяльна-культурных і маральна-этычных норм, адобраных грамадствам. Для выяўлення станаўлення адзінкі *каштоўнасныя арыентацыі* варта звярнуцца да рэтраспектыўнага аналізу.

Перыядызацыя развіцця методыкі беларускай мовы, прапанаваная прафесарам М.Г. Яленскім, уключае тры этапы: з 1920 па 1930 год, з 1940 па 1980 год і канец XX – пачатак XXI стагоддзя [2, с. 4–8]. У межах вылучаных перыядаў прааналізуем праграмы і падручнікі па беларускай мове з мэтай прасачыць фарміраванне каштоўнасных арыентацый вучняў як адну з задач школьнай моўнай адукацыі.

*Перыяд станаўлення моўнай адукацыйнай практыкі і лінгваметодыкі,* які ахоплівае *1920–1930-я гады*, характарызуецца падрыхтоўкай першых праграм і падручнікаў па беларускай мове, метадычных дапаможнікаў для настаўнікаў. Як вядома, у пачатку 20-х гадоў XX стагоддзя змест навучання падпарадкоўваецца ідэям будаўніцтва сацыялізму і камунізму. Менавіта ў гэты час пачалася актыўная прапаганда каштоўнасцей беларускай культуры, якія мелі прыярытэтнае значэнне для маладой савецкай дзяржавы. Першыя праграмы 1920-х гадоў скіраваныя на агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці, мова разглядалася як сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці і культурнай ідэнтычнасці. Так, складальнікі праграмы 1920 года былі перакананы: "Будучыня беларускага народа залежыць ад таго, якую ён мае і будзе мець школу: ці кветкі чужой культуры стануць здабыткамі вучня, ці навучанне зробіць яго свядомым сваёй нацыянальнай годнасці" [3, с. 5]. У 20-я гады XX ст. ствараюцца *комплексныя праграмы*, якія вылучалі тры галоўныя накірункі ў навучанні: прырода, праца і грамадства. Праграмы арыентавалі вучняў на актыўнае жыццё і працу ў сацыялістычным грамадстве, фарміравалі каштоўнасныя арыентацыі праз удзел у сацыяльных аб'яднаннях і калектыўнай працы. Тагачасная педагагічная думка сфакусіравала ўвагу на развіцці здольнасцей, актыўнасці і сацыяльнай адказнасці вучняў.

Падручнікі, адпаведныя комплексным праграмам, увасабляюць ідэю падрыхтоўкі да жыцця. Напрыклад, у "Практычнай граматыцы беларускай мовы" В.У. Астроўскай (1931 год) тэксты, практыкаванні паслядоўна адлюстроўваюць каштоўнасныя арыентацыі, якія падтрымлівала і чакала бачыць сацыялістычная супольнасць: жыць інтарэсамі краіны і камуны, імкнуцца да росквіту і дабрабыту сваёй Радзімы, быць культурным і адукаваным, прымаць ідэі Камуністычнай партыі, вучыцца працаваць у калектыве, выконваць гігіенічныя правілы, фізічныя практыкаванні, адказна ставіцца да свайго здароўя, развіваць народную гаспадарку, берагчы прыродныя багацці БССР, услаўляць і паважаць Чырвоную армію, цаніць і шанаваць мірнае жыццё ў сваёй краіне. Напрыклад, тэкст "Вясна ў БССР", які, як і шматлікія іншыя, услаўляе мірнае і шчаслівае жыццё беларусаў, ідэалізуе савецкую рэчаіснасць: *"Вясна выяўляе сябе ўсё больш з кожным днём. Ажыла прырода пасля доўгага зімовага сну. Усё зелянее, усё квітнее, усё каласіцца, усё радуецца сонцу і цяплу. Разгортваецца з кожным днём і жыццё краіны. Будуюцца па ўсёй дзяржаве новыя фабрыкі і заводы, будуюцца кватэры для рабочых, шпаркім крокам ідзе будаўніцтва новага жыцця і новых спосабаў працы ў калгасах і саўгасах. Уся Савецкая Беларусь перажывае сваю вясну. Яна расквітае і мацнее ў безупыннай працы пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі"* [4, с. 120]. Змест тэксту выразна адлюстроўвае калектыўныя

каштоўнасці: будаўніцтва новага жыцця ў Савецкай Беларусі, зладжаная праца, развіццё індустрыі і сельскай гаспадаркі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі.

Пастанова ЦК УКП(б) ад 1932 года акрэслівала неабходнасць павышэння якасці выхавання праз ідэю фарміравання патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці. Праграмы і падручнікі 20–30-х гадоў XX стагоддзя былі прасякнуты духам пралетарскага інтэрнацыяналізму, ідэяй развіцця беларускай мовы і культуры як сродку выхавання маладога пакалення. У тэкстах падручнікаў мэтанакіравана прапагандуюцца сацыялістычныя нормы і ідэалы.

*Перыяд 1940–1980-х гадоў звязаны з развіццём савецкай сістэмы моўнай адукацыі.* У пасляваенныя гады Акадэмія педагагічных навук РСФСР разам з Навукова-даследчым інстытутам педагогікі Міністэрства асветы БССР арганізавалі абмеркаванне актуальных праблем у сферы адукацыі. Былі выдадзены навукова-метадычныя дапаможнікі аб выкладанні вучэбных прадметаў у школе адпаведна з вучэннем І.В. Сталіна аб мове. Моўная адукацыя гэтага часу арыентавалася на сацыяльнае развіццё вучняў, каштоўнасці бесперапыннага навучання і даследчай дзейнасці, мова прызнаецца сацыяльнай з'явай, сродкам зносін і культурнага вызначэння асобы.

Аўтары падручніка "Граматыка беларускай мовы" (1951) для сямігадовай і сярэдняй школы М.І. Жыркевіч і А.С. Карзон прытрымліваюцца сталінскага вучэння аб каштоўнасці мовы як сродку выхавання і адукацыі, барацьбы за сацыялістычнае грамадства. Практыкаванні і заданні ў падручніку прасякнуты ідэямі выхавання патрыятызму, павагі да Савецкай арміі і ўслаўлення жыцця і подзвігу герояў Вялікай Айчыннай вайны: "*Незадоўга да Айчыннай вайны Мікалаю Гастэла прыйшлося ляцець над беларускай зямлёй. Ён убачыў бярозавыя гаі, бліскучыя азёры, зялёныя ўзбярэжжы рэк. І ўсім сэрцам Мікалай адчуў замілаванне да беларускай прыроды, да роднай зямлі. Глыбока быў узрушаны Мікалай Гастэла, калі даведаўся, што нямецкія акупанты ўварваліся на савецкую зямлю. Любоў да бацькаўшчыны і нянавісць да ворага ўзнялі яго ў арліны палёт. Любоў і нянавісць далі яму мужнасць і адвагу*" [5, с. 31]. Бясхітрасныя, напоўненыя шчырымі пачуццямі тэксты падручнікаў выхоўвалі маленькага грамадзяніна вялікай краіны, напаўнялі яго сэрца жаданнем самаадданa вучыцца і працаваць.

У гэты час каштоўнасныя арыентацыі вучняў вызначаліся камуністычнай ідэалогіяй. Школа і настаўнікі фарміравалі пачуццё любві і адданасці Савецкай Радзіме і Камуністычнай партыі. Гэта пазіцыя стала асноўным светапоглядным накірункам моўнай адукацыі. На Пленуме ЦК КП Беларусі ў 1963 годзе былі сфармуляваны задачы павышэння якасці выкладання і фарміравання камуністычнай ідэалогіі. Сувязь тэарэтычнага матэрыялу з практыкай камуністычнага будаўніцтва з'яўляецца галоўнай у пабудове зместу навучання праграм і падручнікаў.

Нягледзячы на культурна-грамадскія трансфармацыі ў савецкай краіне, каштоўнасныя арыентацыі, адлюстраваныя ў адукацыйных праграмах і падручніках 70-х гадоў, застаюцца нязменнымі, устойлівымі: сумленная вучоба, самастойнасць, патрыятызм, адданасць сваёй Радзіме. У 80-х гадах XX стагоддзя ўвага дзяржавы і грамадства накіраваная на адраджэнне і захаванне духоўнай і матэрыяльнай культуры. Узмацняюцца каштоўнасныя адносіны да мовы, актуалізуецца пачуццё павагі да іншых моў і культур.

*Найноўшы перыяд (канец XX – пачатак XXI стагоддзя) звязаны з развіццём сучаснай моўнай адукацыі і лінгваметодыкі ў Рэспубліцы Беларусь.* У 90-я гады XX ст. адбываюцца значныя рэформы ў педагагічнай навуцы і школьным навучанні. Распрацоўваецца Канцэпцыя моўнай адукацыі, у якой сутнасна вызначаны стратэгічныя задачы: фарміраванне грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, удумлівага чытача, адукаванага суразмоўніка, спагадлівага, высакароднага чалавека.

Практычная рэалізацыя ідэй Канцэпцыі пачалася са стварэння новых праграм па беларускай мове, падрыхтаваных пад кіраўніцтвам славутых метадыстаў В.У. Протчанкі і Г.М. Малажай. Змест праграм для сярэдняй школы (5–11 класы) скіроўваўся на гуманізацыю і дэмакратызацыю адукацыі, прызнанне мовы сродкам трансляцыі культуры, сацыяльна-культурным здабыткам нацыі. Праграма па мове 2002 года рэалізавала актуальныя тэндэнцыі распрацаванай канцэпцыі.

Стваральнікі імкнуліся звярнуць увагу педагагічнай супольнасці да ролі моўнай асобы ў грамадстве. Вядучы асобасны падыход прадугледжваў фарміраванне і развіццё каштоўнасных арыентацый вучняў: грамадзянскасць і патрыятызм, далучэнне да айчыннай і сусветнай культуры як сістэмы каштоўнасцей, свядомае стаўленне да нацыянальных здабыткаў, любоў да Айчыны, духоўнасць. Канец XX – пачатак

XXI стагоддзя вызначаецца распрацоўкай канцэпцый моўнай адукацыі, адукацыйных стандартаў, новых праграм па вучэбных прадметах і факультатыўных занятках, падрыхтоўкай падручнікаў, дыдактычных матэрыялаў (Г.М. Валочка, Л.С. Васюковіч, В.У. Зелянко, В.П. Красней, Я.М. Лаўрэль, В.І. Несцяровіч, І.М. Саматыя, С.А. Язерская, С.М. Якуба, М.Г. Яленскі).

Прафесар В.У. Протчанка падкрэсліваў бясспрэчную ісціну, выверану часам: “Люстрам нацыянальнай культуры, формай яе існавання і хавальніцай з’яўляецца мова карэннага насельніцтва” [6, с. 19]. На думку навукоўца, менавіта праз моўную адукацыю адбываецца духоўнае станаўленне асобы, засваенне і захаванне сацыяльна-культурнага вопыту народа. Метадыст пераканаваны, што *каштоўнасці* ўвасабляюць павагу да нацыянальнай культуры і мовы, маюць прыярытэтнае значэнне для выхавання асобы і стабільнасці грамадства. Нацыянальныя каштоўнасці выступаюць, у сваю чаргу, асновай для агульначалавечай культуры.

У рэчышчы асобасна арыентаванага навучання М.Г. Яленскі акцэнтуе ўвагу на прызнанні каштоўнасных адносін да дзіцяці, яго непаўторнасці, індывідуальнасці. Асобасны падыход разглядаецца з пазіцый “цэласнай асобы з улікам яе індывідуальных асаблівасцей, патрэбнасцей і здольнасцей на аснове *агульначалавечых каштоўнасцей* – свабоды, гуманізму, дабра – яны арыентаваныя на чалавека, які ў працэсе пазнання самаразвіваецца, шукае сэнс дзейнасці, сумняваецца, робіць самастойны выбар, здольны да творчай самарэалізацыі і рэфлексіі” [2, с. 25]. Вучоны падкрэслівае ролю адукацыі як каштоўнаснага працэсу развіцця індывідуальных здольнасцей і псіхалагічных якасцей навучэнца.

Прафесар В.А. Маслава вызначае *каштоўнасці* як аб’екты з найбольш выразнай пазітыўнай ацэнкай, што служаць своеасаблівым эталонам у культуры і грамадстве, займаюць вызначальнае месца ў структуры моўнай асобы; ахопліваюць мэты, якія рэгламентуюць правілы калектыўнай жыццядзейнасці, даюць пераважна станоўчыя эмоцыі. Каштоўнасці не маюць універсальнага характару і могуць адрознівацца ў залежнасці ад культурнага кантэксту. Даследчык вылучае прыярытэт агульнаграмадскіх каштоўнасцей (сям’я, дзеці, Радзіма, мова, мір, поспех, свабода), якія “характарызуюць чалавека ў яго дзейнасці і дэтэрмінуюць нормы паводзін асобы” [7, с. 6].

У сучасных адукацыйных рэаліях паняцце каштоўнасці развіваеццца ў рэчышчы аксіялагічнага падыходу як інструмента ўзаемасувязі паміж светапоглядным, сацыяльным і культурным фактарамі. Ва ўмовах дадзенага падыходу гэтае паняцце становіцца ключавым. Даследчыкі (Л.В. Вяршыніна, А.Д. Дзейкіна, А.В. Кір’якова, З.І. Раўкін, В.А. Сласценін і інш.) адзначаюць узаемасувязь сістэмы каштоўнасцей з мовай і культурай. Сутнасць аксіялагічнага падыходу раскрываецца ў фарміраванні каштоўнасных адносін, якія прадвызначаюць станаўленне дзіцяці як асобы, індывіда і суб’екта дзейнасці.

Прафесар А.Д. Дзейкіна ў канцэпцыі аксіялагічнага навучання мове падкрэслівае значнасць фарміравання каштоўнасных адносін да мовы як да культурна-нацыянальнага феномена, у якім адлюстраваныя традыцыі, сувязь гісторыі народа і мовы [8, с. 15]. А.В. Кір’якова вылучае каштоўнасці як аб’екты, якія ўплываюць на жыццёвыя пазіцыі асобы, адзначае высокую місію адукацыі ў іх асэнсаванні і суб’ектывізацыі. Вучоны сцвярджае, што пры навучанні неабходна актыўна выкарыстоўваць набыткі аксіялогіі, “разглядаць адукацыю з пазіцый гэтай новай сферы навукі, праз адукацыю ўмацоўваць эмацыянальную сферу” [9, с. 132]. У псіхалагічных даследаваннях *каштоўнасныя арыентацыі* прынята лічыць істотным кампанентам структуры асобы. Псіхолагі даследуюць працэсы засваення каштоўнасцей у час сацыялізацыі асобы. Механізм фарміравання каштоўнасных арыентацый выяўляецца ў прысваенні або адмаўленні пэўных мадэляў паводзін, поглядаў, ідэалаў.

Знакаміты псіхолаг Д.А. Лявонцьеў пытанне *каштоўнасцей* і *каштоўнасных арыентацый* распрацоўвае ў кантэксце адносін асобы да рэчаіснасці. Вучоны адзначае: псіхалагічным феноменам каштоўнасць становіцца тады, калі набывае асобасны характар [10, с. 22]. Даследчык сфармуляваў апорныя тэзісы для разумення каштоўнасцей як шматмернай з’явы, што адыгрывае выключную ролю ў станаўленні асобы:

1) пэўныя аб’екты набываюць каштоўнасць ці самі выступаюць у ролі каштоўнасцей;

2) каштоўнасці разглядаюцца як значныя для суб’екта прадметы, якія задавальняюць яго патрэбнасці;

3) каштоўнасці разумеюцца як выключна індывідуальная з’ява, зыходная надындывідуальная рэальнасць;

4) індывідуальныя карэляты каштоўнасцей уплываюць на індывідуальную дзейнасць праз механізмы свядомага кантролю, яны інтэграваныя ў структуру і матывацыю індывідуальнай дзейнасці і вызначаюць скіраванасць асобы;

5) каштоўнасць усведамляецца як эталон або ідэал [10, с. 24]. Вучоны вылучае тры ўзаемазвязаныя формы існавання каштоўнасцей: асобасныя; групавыя; каштоўнасці як прадукт дзейнасці асобы.

На думку Б.Г. Ананьева, накіраванасць асобы на тую ці іншую дзейнасць вызначае яе *каштоўнасныя арыентацыі*, якія даследчык разглядае ў сувязі з паняццямі мэты дзейнасці, жыццёвай накіраванасці, матывацыі паводзін. У псіхалогіі яны характарызуюць духоўнае развіццё асобы, складаюць *сістэму адносін* асобы да грамадства, групы, працы, да сябе. Паміж каштоўнаснымі арыентацыямі і жыццёвай пазіцыяй асобы існуе цесная ўзаемасувязь. Паводзіны асобы як суб'екта грамадства дэталізуюць матывы, якімі яна кіруецца ў сваёй дзейнасці, мэты і каштоўнасці, на якія накіраваная гэта дзейнасць [11, с. 145].

З пункту погляду Н.А. Жураўлёвай, паняцці *каштоўнасць* і *каштоўнасныя арыентацыі* не ідэнтычныя. *Каштоўнасці* даследчык вызначае як прадметы і аб'екты навакольнай рэчаіснасці, якія маюць станоўчае або адмоўнае значэнне для асобы. *Каштоўнасныя арыентацыі* разглядаюцца як адносіны асобы да значымых аб'ектаў; імкненне, цікавасць да жыццёвых каштоўнасцей; накіраванасць асобы на каштоўнасці; уяўленне асобы аб жыццёвых каштоўнасцях; устаноўка асобы на пэўныя каштоўнасці [12, с. 28]. Паводле Н.А. Жураўлёвай, *каштоўнасныя арыентацыі* разумеюцца як адносна стабільная, сацыяльна абумоўленая накіраванасць асобы на мэты, якія вызначаюць сэнс жыцця, спосабы дасягнення гэтых мэт, што выяўляюцца праз асабістыя якасці і мадэлі паводзін.

**Заключэнне.** Такім чынам, у сучасных педагагічных і псіхалагічных працах паняцце *каштоўнасныя арыентацыі* трактуецца неадназначна. Некаторыя даследчыкі не праводзяць дыферэнцыяцыі паміж *каштоўнаснымі арыентацыямі* і *каштоўнасцямі*, часта гэтыя паняцці атаясамліваюцца. Як правіла, у навуковых працах выкарыстоўваецца паняцце *каштоўнасці*, пад якімі разумеюцца сацыяльныя нормы, жыццёвыя прынцыпы, якія фарміруюць матывацыю і паводзіны, вызначаюць сацыяльныя і культурныя арыенціры, спрыяюць гарманічнаму развіццю чалавека. *Каштоўнасныя арыентацыі* – гэта ўстойлівая сістэма адносін асобы, што фарміруецца пад уплывам сацыяльнага асяроддзя і індывідуальнага вопыту, рэгулюе паводзіны і дзейнасць чалавека, вызначае яго мэты, ідэалы і жыццёвыя стратэгіі. Каштоўнасныя арыентацыі – унутраны, эмацыянальна засвоены суб'ектам эталон дзейнасці, які ўспрымаецца як унутраны рэгулятар паводзін. Фарміраванне каштоўнасных арыентацый не адбываецца аўтаматычна, спантанна, а патрабуе спецыяльна арганізаванай, мэтанакіраванай педагагічнай дзейнасці. *Каштоўнасныя арыентацыі* ўплываюць на матывы, эмоцыі, успрыманне і мысленне. Яны вызначаюць найперш, як асоба ўспрымае сябе і іншых, як рэагуе на розныя сітуацыі, як прымае рашэнні.

Айчынная моўная адукацыя незалежна ад этапу развіцця арыентавалася на выпрацоўку каштоўнасных арыентацый вучняў, забяспечвала далучэнне асобы да культуры праз фарміраванне светапоглядных і маральных пазіцый, учынкаў, прынятых грамадствам у якасці эталона сацыяльных паводзін. Так, *перыяд 1920–1930 гадоў* у развіцці лінгваметодыкі характарызуецца стварэннем праграм і падручнікаў, змест якіх выступаў базай для асэнсавання ролі моўнай адукацыі. Каштоўнасныя арыентацыі разумеліся найперш як інструмент для фарміравання этнічнай самасвядомасці і культурнай ідэнтычнасці. Акцэнтаваліся агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці, увага надавалася актыўнаму ўдзелу вучняў у грамадскім жыцці. *Перыяд 1940–1980-х гадоў* вызначаецца стабільным развіццём савецкай сістэмы адукацыі. Тагачасныя падручнікі і праграмы скіроўваюцца на выхаванне патрыятызму і адназначнае прыняцце савецкіх ідэалаў. Мова культывуецца як сродак камунікацыі і культурнага самавызначэння асобы. Тэксты падручнікаў мэтанакіравана вучаць маладое пакаленне любіць Радзіму, услаўляць Савецкую армію, спазнаваць гісторыю краіны. Каштоўнасныя арыентацыі сфакусіраваны на адукацыі, культуры, выхаванні патрыятычных пачуццяў. *У канцы ХХ – пачатку XXI стагоддзя* адбываюцца сутнасныя рэформы ў сістэме адукацыі. У прынятай канцэпцыі змест моўнай адукацыі заснаваны на прынцыпах гуманізацыі і дэмакратызацыі. Праграмы ў якасці прыярытэтаў вылучаюць грамадзянскую адказнасць, традыцыі нацыянальнай культурнай спадчыны і высокую духоўнасць вучняў. Агульнапрызнаны асобасны падыход актуалізуе ўмовы для паўнацэннага развіцця

моўнай асобы, каштоўнаснага выбару індывідуальнай адукацыйнай траекторыі ў адпаведнасці са здольнасцямі, патрэбнасцямі, інтарэсамі вучняў.

Сучасныя праграмы акцэнтуюць лінгвакультуралагічны падыход, заснаваны на станаўленні вучня як носьбіта нацыянальнай і агульначалавечай культуры, на разуменні адукацыі як уласнай і грамадскай каштоўнасці, выхаванні актыўнай, творчай, высокамаральнай асобы, якая паважае Радзіму, ведае яе гісторыю і культуру. У сучасных умовах фарміраванне *каштоўнасных арыентацый* вучняў падразумявае сінтэз сацыяльнага і індывідуальнага, рацыянальнага і эмацыянальна-пачуццёвага кампанентаў, якія выступаюць індыкатарам інтэлігентнасці асобы, знакам засваення культурнага кода свайго народа.

### *ЛІТАРАТУРА*


1. Образовательный стандарт общего среднего образования: постановление Министерства образования Республики Беларусь, утв. 26.12.2018 г., № 125 // Национальный образовательный портал / Национальный институт образования. – Минск, 2018. – URL: https://adu.by/images/2023/obr/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf (дата обращения: 10.02.2024).
2. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах: вучэбны дапаможнік / Н.М. Антановіч [і інш.]; пад рэд. М.Г. Яленскага. – Мінск: Вышэйшая школа, 2020. – 263 с.
3. Праграмы беларускае ніжэйшае пачатковае школы. – Мінск: Цэнтр. Беларус. шк. рада, 1920. – 64 с.
4. Астроўская, В.У. Практычная граматыка беларускай мовы: рабочая кніга для 3-га года навучання / В.У. Астроўская. – Мінск: Беларус. дзярж. выд-ва, 1931. – 128 с.
5. Жыркевіч, М.І. Граматыка беларускай мовы: падручнік для сямігадовай і сярэдняй школы / М.І. Жыркевіч, А.С. Карзон. – Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1951. – 130 с.
6. Протчанка, В.У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В.У. Протчанка. – Мінск: НІА, 2001. – 211 с.
7. Славянские ценности в коммуникативном пространстве регионов: коллективная монография / В.А. Маслова [и др.]; под ред. В.А. Масловой, М.В. Пименовой; М-во образования Респ. Беларусь, Витеб. гос. ун-т им. П.М. Машерова и др. – Минск: Энциклопедикс, 2017. – 267 с.
8. Дейкина, А.Д. Аксиологическая методика преподавания русского языка: монография / А.Д. Дейкина. – М.: МПГУ, 2019. – 281 с.
9. Кирьякова, А.В. Аксиология образования: прикладные исследования в педагогике / А.В. Кирьякова, Т.А. Ольховая, И.Д. Белоновская. – 3-е изд., стер. – М.: ФЛИНТА, 2021. – 294 с.
10. Леонтьев, Д.А. Ценность как междисциплинарное понятие: опыт многомерной реконструкции / Д.А. Леонтьев // Вопросы философии. – 1996. – № 4. – С. 15–26.
11. Ананьев, Б.Г. Человек как предмет познания / Б.Г. Ананьев. – СПб.: Питер, 2018. – 288 с.
12. Журавлева, Н.А. Психология социальных изменений: ценностный подход / Н.А. Журавлева. – М.: Институт психологии РАН, 2013. – 524 с.


### *REFERENCES*


1. *Obrazovatelny standart obshchego srednego obrazovaniya: Postanovleniye Ministerstva obrazovaniya Respubliki Belarus* [Educational Standard of General Secondary Education: Decree of the Ministry of Education of the Republic of Belarus, approved on 26.12.2018, No. 125], National Educational Portal / National Institute of Education. – Minsk, 2018. – URL: https://adu.by/images/2023/obr/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf (Accessed: 10.12.2024).
2. *Metodyka vykladannia belaruskai movy i litaraturnaga chytannia u pachatkovykh klassakh: vuchebny dapamozhnik* [Methodology of Teaching Belarusian Language and Literature Reading in Primary Years: Textbook], N.M. Antonovich, Minsk: Vysheishaya shkola, 2019, 263 p.
3. *Pragramy belaruskaye nizheishaye pachatkovaye shkoly* [Curricula of the Belarusian lower primary school], Minsk: Tsentr. Belarus. shk. rada, 1920, 64 p.
4. Astrovskaya V.U. *Praktychnaya gramatyka belaruskai movy: rabochaya kniga dlia 3-ga goda navuchannia* [Practical Grammar of the Belarusian Language: Workbook for the 3rd Year], Minsk: Belarus. dziarzh. vyd-va, 1931, 128 p.
5. Zhyrkevich M.I., Karzon A.S. *Gramatyka belaruskai movy: padruchnik dlia siamigadovai i siaredniay shkoly* [Grammar of the Belarusian Language: Textbook for Seven-Year and Secondary Schools], Minsk: Dziarzh. vyd-va BSSR, 1951, 130 p.
6. Protchanka V.U. *Aktualniye prablemy teoryi i praktyki navuchannia belaruskai move* [Current Problems of Theory and Practice of Teaching the Belarusian Language], Minsk: NIA, 2001, 211 p.
7. *Slavianskiye tsennosti v kommunikativnom prostranstve regionov: kollektivnaya monografiya* [Slavic Values in the Communicative Space of Regions: Collective Monograph], V.A. Maslova and others, Minsk: Entsiklopediya, 2017, 267 p.
8. Deikina A.D. *Aksiologicheskaya metodika prepodavaniya russkogo yazyka: monografiya* [Axiological Methodology of Teaching the Russian Language: Monograph], M.: MPGU, 2019, 281 p.
9. Kiryakova A.V., Olkhova T.A., Belonovskaya I.D. *Aksiologiya obrazovaniya: prikladniye issledovaniya v pedagogike* [Axiology of Education: Applied Research in Pedagogy], M.: FLINTA, 2021, 294 p.
10. Leontiev D.A. *Voprosy filosofii* [Issues of Philosophy], 1996, 4, pp. 15–26.
11. Ananyev B.G. *Chelovek kak predmet poznaniya* [Man as an Object of Knowledge], SPb.: Piter, 2018, 288 p.
12. Zhuravleva N.A. *Psikhologiya sotsialnykh izmeneni: tsennostniy podkhod* [Psychology of Social Changes: A Value-Based Approach], M.: Institut psikhologii RAN, 2013, 524 p.


*Паступіў у друк 10.01.2025*

***Адрас для карэспандэнцыі:*** e-mail: metod.kab32@gmail.com – Андрэйчык В.І.